# РОЛЯ СЯМ'І Ў ВЫХАВАННІ ПАТРЫЯТЫЧНЫХ ПАЧУЦЦЯЎ У ДЗЯЦЕЙ ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ

Безумоўна, аснова выхавання чалавека закладваецца ў сям'і. Патрыятычнае выхаванне, цікавасць да духоўнага пачатку нашага жыцця таксама павінны пачынацца ў сям'і. Без сям'і немагчыма паўнавартаснае выхаванне чалавека. Тут развіваюцца яго лепшыя якасці, фарміруецца асоба. Сям'я з'яўляецца мадэллю грамадства, у якой і з дапамогай якой дзіця спазнае гісторыю, духоўную культуру, традыцыі народа, свой радавод.

Род, Радзіма, народ – невыпадкова аднакарэнныя словы. Гэта формула грамадзянскага патрыятызму, у аснове якой ляжыць пачуццё Радзімы, адказнасці і салідарнасці.

Існуюць разнастайныя формы выхавання ў дзяцей патрыятычных пачуццяў. Гэта гутаркі аб Радзіме, аб родным горадзе, аб прыродзе роднага краю, аб добрых людзях, чытанне дзіцячых кніг на патрыятычныя тэмы, выкарыстанне дзіцячага фальклору, адпаведны падбор песень і вершаў для развучвання і, вядома, асабісты прыклад бацькоў.

***Прагулка.*** Пры знаёмстве з роднымі мясцінамі вельмі важнымі з’яўляюцца сумесныя прагулкі бацькоў з дзецьмі, падчас якіх можна прапанаваць дзецям гульню «Хто больш заўважыць цікавага?", "Давай распавядаць адзін аднаму, хто больш цікавага заўважыць на нашай вуліцы?» і інш. Звяртайце ўвагу дзяцей на транспарт, будынкі, людзей, прыроду. Дапамажыце дзіцяці убачыць тое, што найбольш важна: праца людзей, пераўтварэнні аблічча горада і інш. Расказвайце дзецям пра помнікі, славутасці, як людзі шануюць памяць герояў Вялікай Айчынай вайны, працы.

***Гутаркі - апавяданні аб сваёй працы.*** Раскажыце дзецям аб сваёй прафесіі, прадпрыемстве, на якім працуеце. Што вы робіце, якую карысць прыносіць людзям ваша праца, што вам падабаецца ў вашай працы, якіх маральных якасцяў яна патрабуе (адказнасці, увагі, уменні, кантактаваць з іншымі людзьмі і інш.), што было б, калі б вы працавалі дрэнна. Калі ёсць магчымасць, правядзіце экскурсію з дзіцем на месцы сваёй працы. Раскажыце, якую прадукцыю вырабляе ваша прадпрыемства, каму і для чаго яна патрэбна, куды яе адпраўляюць.

***Хатняя бібліятэка.*** Добра, калі дома ў дзіцяці ёсць свая паліца з любімымі кнігамі, дзе прадстаўлены разнастайныя казкі нашага народа, кнігі пра людзей розных прафесій, пра прыроду. Безумоўна, цікавыя і карысныя кнігі класікаў рускай дзіцячай літаратуры, вершы, апавяданні сучасных пісьменнікаў. Чытаючы дзецям кнігі, растлумачце асобныя моманты, адкажыце на пытанні дзіцяці, перакажыце з дзіцём пачутае,

завучыце разам асобныя радкі вершаў. Такое сумеснае абмеркаванне зместу кніг карысна і для фарміравання ў дзіцяці правільных уяўленняў аб навакольнай рэчаіснасці, і для выхавання маральных пачуццяў і адносін.

***Наведванне музеяў, выстаў і інш.*** Узбагачайце пачуцці дзіцяці ўражаннямі.

***Гісторыя.*** Абавязкова раскажыце дзіцяці пра герояў Вялікай айчынай вайны, медалі, сямейныя рэліквіі. Чытанне літаратуры пра вайну, пра подзвігі герояў, слуханне песень ваенных гадоў, удзел у парадзе 9 Мая фарміруе ў дзяцей паняцце, што вайна - гэта агульная бяда, і што ад іх залежыць будучыня Радзімы.

***Займальныя падарожжа.*** Можна здзяйсняць падарожжа, маючы пад рукою глобус, карту або альбомы. Падарожнічаць можна ўсёй сям'ёй. Разглядаючы ілюстрацыі, распавядаючы пра цікавыя факты, бацькі ўзбагачаюць веды і ўяўленні дзяцей аб родным краі.

***Прырода роднага краю.*** Зносіны з прыродай робіць чалавека больш чулым, спагадлівым. Карысна адправіцца з дзіцём зімою на лыжах, летам на ровары або пешшу. Выхоўваючы любоў да прыроды роднага краю,

Выкарыстоўваючы прапанаваныя формы патрыятычнага выхавання, неабходна паказаць дзецям прыгажосць свайго роднага краю, пазнаёміць з талентам беларускага народа, навучыць дзяцей любіць свой горад і сваю краіну і ганарыцца тым, што яны жывуць у такой цудоўнай краіне, як Беларусь.

**Патрыятызм** – гэта пачуццё любові да Радзімы. Духоўны, творчы патрыятызм трэба прывіваць з ранняга дзяцінства. Але падобна любому іншаму пачуццю, патрыятызм жыве самастойна і перажываецца індывідуальна. Ён прама звязаны з асабістай духоўнасцю чалавека, яе глыбінёй. Таму, не будучы патрыётам сам, дарослы не зможа і ў дзіцяці абудзіць пачуццё любові да Радзімы. Менавіта абудзіць, а не навязаць, так як у аснове патрыятызму ляжыць духоўнае самавызначэнне.

*ЗНАЁМІМСЯ разам:*

*1 кастрычніка 2021г. пачаў працаваць першы беларускамоўны ютуб-канал БЭЙБУС для маленькіх гарэз і дарослых жэўжыкаў http://kazki.by/ Адна з галоўных мэтаў Бэйбуса і яго сяброў — лёгкае і натуральнае прыцягненне ў жыццё дзетак беларускай мовы, любоў да меладычнасці нацыянальнага гучання. Першай з’явіцца казка з серыі “Казкі з Маляванычам” пад назвай “Лагодны цмок”.*

*Краіна казак https://dzietkam.knihi.com/*

*Беларускія народныя казкі для дзетак http://kazki.unicef.by/*